**ПАЛІТЫКА**
▪Рада Бясьпекі Беларусі прыняла канчатковае рашэньне аб будаўніцтве ў краіне ўласнай атамнай электрастанцы
▪МЗС Беларусі задаволенае адносінамі з Эўразьвязам

**АФІЦЫЙНА**
▪Міністар Навумаў лічыць акцыю прадпрымальнікаў хуліганствам
▪„Пэрспэктыве" пагражае ліквідацыя

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪"Малады Фронт" урэшце зарэгістраваны. У Чэхіі

**ЭКАНОМІКА**
▪У 2007 годзе інфляцыя перавысіла прагноз у два разы

**ГРАМАДЗТВА**
▪Ня выплаціў штраф за праезд "зайцам" — трапіш у сьпіс

**КУЛЬТУРА**
▪Пратэстанты супраць БРСМ і рэклямы акультызму

Цягам апошніх дзён адбываліся суды над удзельнікамі несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў, якая прайшла ў Менску 10 студзеня. У выніку адміністрацыйнымі арыштамі пакараныя некалькі дзясяткаў чалавек. Гэтымі пакараньнямі справа можа ня скончыцца, бо сталічная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу паводле артыкулу аб масавых беспарадках. Тым часам Міністэрства юстыцыі падало ў Вярхоўны суд пазоў аб ліквідацыі аб'яднаньня прадпрымальнікаў "Пэрспэктыва", лідэр якога Анатоль Шумчанка быў адным з арганізатараў акцыі 10 студзеня.

На думку назіральнікаў, такая нэрвовая рэакцыя на пратэст прадстаўнікоў дробнага бізнэсу сьведчыць аб спалоху ўладаў. Паводле колькасьці ўдзельнікаў маніфэстацыя 10 студзеня параўнальная з апазыцыйнымі маршамі мінулай восені. Але істотнае адрозьненьне палягае ў тым, што зараз да вулічнага пратэсту дасьпелі прадстаўнікі раней апалітычнага слою. Прычым цягам згаданай акцыі эканамічныя лёзунгі стыхійна перарасьлі ў палітычныя.

Рэпрэсіямі супраць лідэраў і актывістаў прадпрымальніцкага руху ўлады спрабуюць зьменшыць маштаб новага мітынгу прадпрымальнікаў, прызначанага на 21 студзеня.

Аднак рэпрэсіўныя захады ня здольныя суцішыць незадаволенасьць дробных бізнэсоўцаў. Іх галоўнае патрабаваньне — скасаваць адзін з пунктаў прэзыдэнцкага ўказу №760, што забараняе індывідуальным прадпрымальнікам (ІП) зь 1 студзеня бягучага году наймаць працаўнікоў.

У якасьці выйсьця ўрад прапануе афармляць свой бізнэс у якасьці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства. Аднак, паводле слоў прадпрымальнікаў, гэта цягне за сабой неабходнасьць мець бухгальтара, весьці вялікі аб'ём дакумэнтацыі, а ў выніку азначае істотнае павелічэньне падаткаў ды іншых затратаў. Для многіх бізнэс становіцца элемэнтарна нерэнтабэльным.

Сярод прадпрымальнікаў пашыранае меркаваньне, што яны сталі ахвярамі лябісцкіх высілкаў з боку буйнейшага бізнэсу, блізкага да намэнклятурных колаў і зацікаўленага ў тым, каб выціснуць канкурэнтаў. Са свайго боку, кіраўніцтва краіны і падначаленыя яму мэдыі абвінавачваюць ІП у выкарыстаньні шэрых схемаў, ухіленьні ад падаткаў і дэмпінгу, які б'е па пазыцыях дзяржаўнай прамысловасьці.

Шэраг аналітыкаў лічыць, што праз адсутнасьць нармалёвай зваротнай сувязі з грамадзтвам кіраўніцтва краіны апошнім часам зрабіла шэраг сур'ёзных памылак, якія абвастрылі сацыяльную напружанасьць. У прыватнасьці, гаворка ідзе пра скасаваньне летась у сьнежні сацыяльных ільготаў, што закранула дзьве трацінын насельніцтва, і згаданую канфрантацыю зь ІП праз нашумелы ўказ №760.

Некаторыя экспэрты прагназуюць, што зараз кіроўныя вярхі паспрабуюць ужыць палітыку пугі і перніка: з аднаго боку, будзе доўжыцца запалохваньне ІП праз кропкавыя рэпрэсіі, зь іншага — магчымыя дробныя саступкі, закліканыя зьнізіць градус незадаволенасьці. Улады не зацікаўленыя, каб напружанасьць у асяродзьдзі ІП захавалася да вясны, калі палітычная апазыцыя пачне ладзіць традыцыйныя маршы.

Са свайго боку, лідэры тытульнай апазыцыі, адчуўшы спрыяльную кан'юнктуру, імкнуцца ачоліць пратэсты прадпрымальнікаў і надаць ім выразную палітычную накіраванасьць. Кіраўнікі шэрагу партый удзельнічалі ў падзеях 10 студзеня, а старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Анатоль Лябедзька арыштаваны за гэта на 15 сутак.

Звыш таго, Міністэрства юстыцыі запатрабавала ад трох партый, улучна з АГП, тлумачэньняў з нагоды ўдзелу іх лідэраў у несанкцыянаванай акцыі. У партыях мяркуюць, што гэта можа сьведчыць пра намер уладаў разгарнуць працэс ліквідацыі найбуйнейшых апазыцыйных партый (гэтая працэдура ўжо распачатая ў дачыненьні да Партыі камуністаў Беларускай).

Такая "зачыстка" палітычнага поля можа быць зьвязаная і з парлямэнцкімі выбарамі, што маюць адбыцца ўвосень. Ня выключана, што кіроўныя вярхі пойдуць на імітацыю дэмакратычных пераменаў цераз выкарыстаньне сыстэмы выбараў паводле партыйных сьпісаў. Разам з тым, пры дапамозе адміністрацыйнага рэсурсу будзе забясьпечаны электаральны трыюмф праўладнай партыі, на ролю якой могуць выбраць нядаўна створанае высілкамі "зьверху" грамадзкае аб'яднаньне "Белая Русь". Пры такім сцэнары лягічным выглядае варыянт "нэўтралізацыі" найболей дзеяздольных апазыцыйных сілаў — Партыі камуністаў, Партыі БНФ, АГП.

Між тым зьявілася яшчэ адна тэма, якую апанэнты ўлады могуць скарыстаць дзеля яе крытыкі і палітызацыі насельніцтва. Як паведамілі афіцыйныя крыніцы, 15 студзеня на пасяджэньні Рады Бясьпекі, што праходзіла пад старшынствам Аляксандра Лукашэнкі, прынятае "канчатковае палітычнае рашэньне" аб будаўніцтве ў Беларусі атамнай электрастанцыі. Аднак курс на будаўніцтва АЭС у краіне, што найболей пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы, успрымаецца ў грамадзтве як мінімум неадназначна. Так, у Горацкім раёне Магілёўскай вобласьці, які разглядаецца ў якасьці пляцоўкі для станцыі, ужо зьбіраюць подпісы супраць будаўніцтва.

Апазыцыя акцэнтуе ўвагу на келейнасьці рашэньня пра будаўніцтва АЭС, а таксама на ягонай няўзважанасьці. У прыватнасьці, наверсе схіляюцца да таго, каб замовіць энэргаблёкі АЭС у Расеі, што толькі павялічыць залежнасьць ад яе. Акрамя таго, уран імкліва даражае, і ў пэрспэктыве надзея заашчадзіць на паліве можа стацца марнай. На думку незалежных экспэртаў, альтэрнатывай атамнай энэргетыцы для Беларусі ёсьць зьніжэньне энэргаёмістасьці выпусканай прадукцыі (цяпер гэты паказчык у 3–5 разоў вышэйшы, чым у разьвітых краінах).

Паводле міністра фінансаў Беларусі Мікалая Корбута, выдаткі на АЭС складуць 4 мільярды даляраў. Незалежныя экспэрты кажуць, што гэты каштарыс заніжаны прыкладна ўдвая. Некаторыя зь іх лічаць праект АЭС авантурным і мяркуюць, што ён можа спусташыць

эканамічны рэсурс "беларускай мадэлі", які і так зьменшыўся праз падаражаньне расейскіх энэргапаставак.

---

## ПАЛІТЫКА

### Рада Бясьпекі Беларусі прыняла канчатковае рашэньне аб будаўніцтве ў краіне ўласнай атамнай электрастанцыі

**Пра гэта паведамляе БелТА. Да канца студзеня Аляксандар Лукашэнка атрымае на подпіс праект пастановы.**

Кіраўнік краіны, бясспрэчна, яго падпіша, бо, як ён заявіў, „у беларускім грамадзтве ўжо ўсталявалася разуменьне, што альтэрнатывы ядзернай энэргетыцы ў Беларусі няма".

Адначасова будуць будавацца два блёкі: першы павінен быць уведзены ў 2018 годзе, другі — праз год-два. Поўную магутнасьць беларуская атамная станцыя павінна атрымаць у 2020 годзе. Аднак дагэтуль невядома, дзе будзе будавацца станцыя. Месца стане вядомым да канца 2008 г. Разглядаюцца некалькі патэнцыйных пляцовак у Магілёўскай вобласьці, між іншым, у раёне Горак.

Сайт "Хартыя'97" паведамляе, што на мінулым тыдні мясцовыя жыхары стварылі там антыядзерную групу й пачалі збор подпісаў супраць будаўніцтва АЭС.

### МЗС Беларусі задаволенае адносінамі з Эўразьвязам

**Міністэрства замежных спраў Беларусі пазытыўна ацаніла дынаміку адносінаў Беларусі з Эўразьвязам. Пра гэта заявіў прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў.**

Ён зазначыў, што за 2007 год адбыліся вельмі істотныя падзеі: сустрэчы прадстаўнікоў ураду Беларусі з кіраўніцтвам Эўразьвязу, а таксама падпісаньне дамоўленасьці аб адкрыцьці прадстаўніцтва Эўрапейскай камісіі ў Беларусі.

„Мы спадзяемся, што адкрыцьцё прадстаўніцтва Эўрапейскай камісіі створыць аснову для далейшай актывізацыі й пашырэньня нашых адносінаў з Эўразьвязам у такіх кірунках, як энэргетыка, транспарт, транзыт і многіх іншых", — заявіў Андрэй Папоў.

## АФІЦЫЙНА

### Міністар Навумаў лічыць акцыю прадпрымальнікаў хуліганствам

**Міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў лічыць акцыю прадпрымальнікаў актам хуліганства. "Я ня буду расцэньваць гэта як мітынг, а буду настойваць на тым, што гэта — асобны акт хуліганства", — заявіў чыноўнік журналістам.**

Паводле міністра, удзельнікі маніфэстацыі паводзілі сябе, як хуліганы, "скакалі па аўтобусах і білі людзей".

Уладзімер Навумаў таксама лічыць, што апазыцыйныя партыі выкарысталі мітынг прадпрымальнікаў для свайго піяру.

### „Пэрспэктыве" пагражае ліквідацыя

**Міністэрства юстыцыі накіравала ў Вярхоўны суд зыск аб спыненьні дзейнасьці Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня „Пэрспэктыва".**

Зыск аб ліквідацыі аб'яднаньня зьвязаны з удзелам старшыні Анатоля Шумчанкі ў несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў. На сайце Мінюсту зазначана, што падчас акцыі была нанесена шкода грамадзтву й дзяржаве, між іншым, быў пашкоджаны грамадзкі

транспарт ды паралізаваны рух у цэнтры сталіцы.

Адным зь ініцыятараў акцыі стала аб’яднаньне „Пэрспэктыва". Мінюст зазначае, што, згодна з законам „Аб грамадзкіх аб’яднаньнях", дзейнасьць арганізацыі можа быць спынена за парушэньне заканадаўства аб правядзеньні й удзеле ў масавых мерапрыемствах.

## АПАЗЫЦЫЯ

### "Малады Фронт" урэшце зарэгістраваны. У Чэхіі

**"Малады Фронт» афіцыйна зарэгістравалі ў Чэхіі. У Беларусі Фронту 5 разоў адмаўлялі ў рэгістрацыі, а ягоныя сябры перасьледуюцца за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.**

"Маладому Фронту" дапамаглі атрымаць легальны статус у Чэхіі актывісты чэскага грамадзкага аб'яднаньня "Свабодная Беларусь". Ня выключана, што неўзабаве "Маладыя Фронт" зарэгіструюць ва Ўкраіне і ў Польшчы.

Згодна з дакумэнтамі міжнароднага грамадзкага аб’яднаньня "Малады Фронт", арганізацыя мае права мець філіі, а таксама дзейнічаць ва ўсіх краінах Эўропы, у тым ліку ў Беларусі й Украіне.

## ЭКАНОМІКА

### У 2007 годзе інфляцыя перавысіла прагноз у два разы

**У 2007 годзе ў Беларусі спажывецкія цэны выраслі на больш чым 12 % пры прагнозе ўраду на ўзроўні 6—8%.**

Пра гэта паведамляе Агенцтва фінансавых навін, спасылаючыся на дадзеныя Міністэрства статыстыкі й аналізу.

Для параўнаньня, у 2006 годзе спажывецкія цэны падняліся на 6,6%. На бягучы год урад Беларусі плянуе зьнізіць узровень інфляцыі да 6,8%.

## ГРАМАДЗТВА

### Ня выплаціў штраф за праезд "зайцам" — трапіш у сьпіс

**Міністэрства юстыцыі працягвае збор зьвестак пра грамадзянаў, якім забаронены выезд за мяжу. Гэта людзі, якія ўхіляюцца ад выкананьня нейкіх абавязкаў, накладзеных на іх судом.**

Забарона выезду за мяжу дзейнічае да выкананьня абавязацельстваў.

Да гэтай катэгорыі адносяцца асобы, да якіх прад’яўлены грамадзянскі пазоў у судзе, якія маюць абавязкі па пакрыцьцю выдаткаў на ўтрыманьне дзяцей, выплаце алімэнтаў, пагашэньню шкоды, нанесенай злачынствам і гэтак далей. Уся інфармацыя перадаецца ў МУС дзеля разьмяшчэньня ў базе дадзеных аб грамадзянах Беларусі, якім часова забаронены выезд за мяжу.

Так што нават калі нехта мае нявыплачаны штраф за няправільную паркоўку або праезд без квітка ў транспарце, ён ня зможа выехаць з краіны.

## КУЛЬТУРА

### Пратэстанты супраць БРСМ і рэклямы акультызму

**Япіскапы пратэстанцкіх цэркваў выступілі са зваротам да ўладаў не прымушаць да ўступленьня ў БРСМ і Беларускую рэспубліканскую піянерскую арганізацыю (БРПА) ды спыніць рэкляму акультызму ў прэсе й на тэлебачаньні.**

Два лісты былі накіраваныя кіраўніку Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі Генадзю Нявыгласу, у Міністэрства адукацыі ды на тэлебачаньне.

Антоні Бокун, пастыр Царквы Яна Прадвесьніка, кажа, што сытуацыя нагадвае камуністычныя часы.

А.Бокун: Студэнтаў, школьнікаў прымушаюць уступаць у БРСМ, і менавіта

ў сувязі з гэтым быў прыняты зварот япіскапаў, бо пратэстанты і ў савецкія часы адмаўляліся ўступаць у камсамол і піянерскую арганізацыю. Зараз, калі арганізацыі, якія зьяўляюцца спадкаемцам тых арганізацыяў, спрабуюць пад прымусам запісваць моладзь у свае шэрагі, гэта выклікае супраціў. Ад імя ўсіх вернікаў япіскапы зьвярнуліся да ўладаў, каб яны спынілі падобную практыку. Другі зварот прысьвечаны тэме рэклямы акультызму, якой зараз шмат у газэтах, на тэлебачаньні. Япіскапы кажуць, што такую рэкляму неабходна спыніць, таму што гэта сьведчаньне дэградацыі грамадзтва, бо замест таго, каб зьвяртацца да Бога, людзі зьвяртаюцца да астролягаў.

Антоні Бокун падкрэсьлівае, што справа насьпявала тры гады й дасягнула піку, калі паступленьне на некаторыя факультэты ВНУ ставіцца ў залежнасьць ад сяброўства БРСМ. Нагадаем, надоечы з такой ініцыятывай выступіў міністар адукацыі Беларусі Аляксандар Радзькоў.

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.